# Васіль Быкаў
## (1924 - 2003)

Жыццё як творчасць: без кампрамісаў



Будуць часам ідалы раструшчаны,
Свет разумны стоміцца ад крыкаў.
Васільком у жыце Беларушчыны
Назаўсёды застанецца Быкаў!

*Рыгор Барадулін*

# ЗВЕСТКІ З БІЯГРАФІІ ВАСІЛЯ БЫКАВА

- 19 чэрвеня 1924 г. – нарадзіўся ў вёсцы Бычкі на Ушаччыне (Віцебская вобласць) у сялянскай сям'і (бацька – Уладзімір Фёдаравіч, маці – Ганна Рыгораўна). Вельмі любіў маляваць.

- З дзяцінства захапляўся прозай Міхася Лынькова, Янкі Маўра, паэзіяй Янкі Купалы і асабліва творчасцю Якуба Коласа, цікавіўся творамі замежных класікаў: Ж. Верна, Дж. Лондана, В. Скота, Т. Драйзера, Э. Хемінгуэя і інш.

- Вучыўся ў Бяляеўскай пачатковай школе, затым – у Кубліцкай сярэдняй, дзе скончыў восем класаў.

- 1939 – 1940 гады – вучыўся на скульптурным аддзяленні Віцебскага мастацкага вучылішча, якое вымушаны быў пакінуць з-за адмены стыпендыі.
- 1941 г. – экстэрнам здаў экзамены за 10 клас, вучыўся ў школе ФЗН у Віцебску, пасля чаго паехаў на Украіну паступаць у індустрыяльны інстытут. Там яго і застала Вялікая Айчынная вайна.
- Лета 1942 г. – прызваны ў армію і накіраваны на вучобу ў Саратаўскае пяхотнае вучылішча.

- 1943 г. – адправіўся на фронт, ваяваў на 2-м і 3-м Украінскіх франтах. У час Кіраваградскай аперацыі быў паранены. Да бацькоў пайшла пахаронка, у якой было сказана, што камандзір узвода 339-га стралковага палка Быкаў Васіль Уладзіміравіч забіты 10 студзеня 1944 года.

*“У мяне быў шынель, у якім я закончыў вайну, увесь прапалены, у некалькіх месцах прастрэлены, прабіты асколкамі. Па сутнасці, гэта чысцейшая выпадковасць, што тыя кулі і асколкі мяне не кранулі…”*



**У Румынii. 1944.**



**Малодшы лейтэнант В. Быкаў з салдатамі свайго падраздзялення. 1944.**

- У 1949 г. зноў прызваны ў армію, служыць на ўсходзе.
- 1955 г. – звольніўся ў запас са званнем маёра, два з лішнім дзесяцігоддзі жыў у Гродна. Спачатку працаваў у “Гродзенскай праўдзе”, потым быў сакратаром абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.
- У 1978 г. пераехаў у Мінск на сталае жыхарства.
- На працягу 1990 – 1993 гг. з’яўляўся прэзідэнтам Аб’яднання беларусаў свету “Бацькаўшчына”.



Пасля балета «Альпійская балада» .В. Быкаў, Я. Глебаў і выканаўцы галоўных роляў.

В. Быкаў, Р. Барадулін. Мінск, 1983.



**У вёсцы Заброддзе ў гасцях у мастака Цітовіча. Валя Цітовіч, Георгі Паплаўскі, Васіль Быкаў.**





**В. Быкаў і А. Адамовіч.**



В. Быкаў, У. Караткевіч, М. Аўрамчык. 1973.

З П. Панчанкам. 1982.



- З канца 1997 г. жыў за мяжой – спачатку ў Фінляндыі, затым у Германіі. З 2002 г. пераехаў у Чэхію. Толькі за месяц да смерці, спакутаваны цяжкай хваробай і смуткам па роднай зямлі, вярнуўся на Радзіму.

*"Свабода – найбольшая маральна-фізічная каштоўнасць, дадзеная кожнай жывой істоце фактам яе нараджэння. (...) Каб у поўнай меры спазнаць і адчуць яе неабходнасць, яму (чалавеку) наканавана прайсці праз хітрасплецены лабірынт жыцця, а то і застацца ў адным з яго тупікоў."*

*В. Быкаў "Доўгая дарога дадому"*

У Пражскай кватэры. Васіль Быкаў, Сяргей Навумчык, Івонка Сурвілла. 24.III.2003





Развітанне з пісьменнікам. 25.VI.2003

# Творчыя здабыткі В. Быкава

- 1947 г. – першы друкаваны твор з'явіўся ў часопісе "Вожык" (апавяданне "Дапякло").
- У 1949 г. у газеце "Гродненская праўда", дзе працаваў журналістам, былі надрукаваны апавяданні на рускай мове "У той дзень", "У першым баі". Сам Васіль Уладзіміравіч адлічвае свае творчыя набыткі з апавяданняў "Смерць чалавека" і "Абознік".
- Вядомасць прынесла аповесць "Трэцяя ракета" (1962). У 1960-х публікуе аповесці "Альпійская балада", "Мёртвым не баліць", у 1970-я – "Сотнікаў", "Абеліск", "Дажыць да світання", "Пайсці і не вярнуцца".

- **Зборнікі** “Ход канём” (1960), “Жураўліны крык” (1960), **аповесці** “Здрада” (1961), “Мёртвым не баліць” (1965), “Круглянскі мост” (1968), “Сотнікаў” (1970), “Абеліск” (1971), “Знак бяды” (1982), “Аблава” (1986), **раман** “Кар’ер” (1986), **цыкл расказаў** “Пахаджане” (1999), **кніга ўспамінаў** “Доўгая дарога дадому” (2002) і інш.

- **ТЭМЫ ТВОРАЎ:** рэпрэсіі 30-х гадоў, гвалтоўная калектывізацыя, барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны; у творах апошніх гадоў – агульначалавечыя праблемы: жыцця і смерці, здрады і сумлення, свабоды асобы, веры ў Чалавека.

# ЭКРАНІЗАЦЫІ І ПАСТАНОЎКІ

- **Фільмы:** “Трэцяя ракета”, “Альпійская балада”, “Ваўчыная зграя”, “Абеліск”, “Знак бяды”, “На чорных лядах” і інш.

- **Музычныя творы:** балет “Альпійская балада” (1967, музыка Яўгена Глебава), опера “Сцяжынай жыцця” (1980, музыка Генрыха Вагнера, паводле “Ваўчынай зграі”)

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ І ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ



- Ленінская прэмія (за аповесць “Знак бяды”, 1986)
- Дзяржаўная прэмія СССР (за аповесці “Дажыць да світання” і “Абеліск”, 1974)
- Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа (за аповесці “Ваўчыная зграя”, “Яго батальён”, 1978)
- Літаратурная прэмія БССР імя Якуба Коласа (за аповесць “Трэцяя ракета”, 1964)
- Народны пісьменнік Беларусі (1980)
- Герой Сацыялістычнай працы (1984)
- Расійская прэмія “Трыумф”

# МАЛЯВАНЫ ДЗЁННІК ВАСІЛЯ БЫКАВА







1


Я обращаюсь к русским коллегам...
Дружба народов
На Центральном телевидении
20 мая 1987 г.

2


Тайная вячэра
93
3. Быкаў
4. Савіцкі
5. Шамякін
6. Танк
12. Кебіч
13. Гілевіч

3



4



5


Постановление
присудить
ПРАВДА
присужденный...
22 апреля 86 года

6



7



8



9



10



11



12



13



14


Великое столпотворение
23-25 янв. 1991
ОБМЕН
– Кто последний?
– Биков